УДК. 327.33(476)

**А.А. Райчонак** (Мінск)

# УПЛЫЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ НА БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ І ПРАЦЭС СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

У артыкуле разглядаецца пытанне аб уплыве міжнародных абставін на развіццё беларускага нацыянальнага руху ў часы Першай Сусветнай вайны. У першую чаргу аналізуецца стаўленне Расіі, Германіі і Польшчы да вырашэння беларускага нацыянальнага пытання. Вызначаюцца асноўныя ўплывы, што уздейнічалі на развіцце і накірунак беларускага нацыянальнага руху. Змены ў ягоных знешнепалітычных арыентацыях і іх адлюстравання ў поглядаг на перспектывы развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Гісторыя ў яе традыцыйным выглядзе – гэта ў значнай ступені гісторыя дзяржаўнасці. Узнікнуўшы ў старажытнасці, дзяржава да сённяшняга часу застаецца тым ядром, вакол якога аб'ядноўваецца грамадства. Прычыны ўзнікнення дзяржавы, формы яе існавання, а таксама тое, што вядзе да крызісу і заняпаду дзяржавы, заўжды цікавілі людзей. Гэта і зразумела, бо цяжка знайсці іншы такі сацыяльны інстытут, які б так уплываў на паўсядзённае жыццё сваіх грамадзян. Росквіт ці заняпад таго ці іншага грамадства заўжды звязвалі са станам яго дзяржавы. Асаблівая цікавасць да дзяржавы як палітычнага інстытута пачынаецца ў Новы час, і звязана яна са з'яўленнем нацыянальнай дзяржавы.

У пачатку XX стагоддзя большаць народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы знаходзіліся ў межах шматнацыянальных Аўстра-Венгерскай і Расійскай імперый, і значная частка з іх адчувалі на сабе розныя формы нацыянальнага прыгнёту. Імперыі, у сваю чаргу, зыходзячы з унутранай логікі, не маглі ды і не жадалі забяспечыць сапраўднае раўнапраўе нацый у сваіх межах, бо гэта было для іх немэтазгодна ні з палітычнага, ні з эканамічнага пункту гледжання. Не атрымоўваючы дзяржаўнай падтрымкі на развіццё ўласнай культуры і матэрыяльнага дабрабыту, адчуваючы на сабе праявы шавінізму, прыгнечаныя нацыі павялі рашучую барацьбу за ўтварэнне ўласных нацыянальных дзяржаў.

Станаўленне дзяржаўнасці не звадзіма толькі да мерапрыемстваў па канкрэтнаму ўвасабленню дзяржавы ў форме традыцыйных палітычных інстытутаў. Гэта працэс, які пачынаецца з узнікнення нацыянальнай ідэалогіі і завяршаецца пабудовай незалежнай дзяржавы. Між імі знаходзіцца цэлы шэраг прамежкавых этапаў. Сярод якіх адным з найбольш важных з'яўляецца стварэнне перадддзяржаўных утварэнняў, да якіх можна аднесці розныя формы аўтаноміі, ад абласной да федэратыўнай, а таксама абвяшчэнне незалежнасці з практычнымі крокамі па яе рэалізацыі да таго моманту, калі ўсе прыкметы дзяржавы будуць у наяўнасці.

У нацыянальна-вызваленчых ідэалогіях нацыянальная дзяржава выступае не толькі як сродак абароны нацыянальных інтарэсаў, але і як сродак забеспячэння прагрэсу нацыі, які падчас мадэрнізацыі выяўляецца ў патрэбе развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі. Нацыянальная дзяржаўнасць як феномен паўстае менавіта ў працэсе мадэрнізацыі грамадства, і, каб паскорыць працэс індустрыялізацыі, імкнецца да ўтварэння ў сваіх межах культурна аднароднага насельніцтва.

Розныя народы па-рознаму прайшлі шлях да сваёй дзяржаўнасці. Большасць еўрапейскіх нацый распачала яго ў XIX стагоддзі, і амаль для ўсіх іх ён быў складаным, а часам і трагічным. Прыблізна ў гэты ж час распачала свой шлях да незалежнасці і Беларусь. Адны краіны прайшлі яго хутка, для іншых ён быў цяжкім і доўгім. Да іх належыць і Беларусь.

Трэба зазначыць, што нараджэнне беларускай дзяржавы адбывалася ў надзвычайна складаных умовах. Першая сусветная вайна, акупацыя, дзве рэвалюцыі, кардынальная змена палітычнага ладу ў Расіі, савецка-польская вайна і станаўленне нацыянальнай дзяржаўнасці ў нашых суседзяў – вось толькі не поўны спіс падзей, якія непасрэдна ўплывалі на беларускі нацыянальны рух і працэс пабудовы дзяржавы. Акрамя таго, гэты працэс не адбываўся ў вакууме. Гэта быў час нараджэння многіх дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія таксама шукалі сваё месца ў пасляваеннай еўрапейскай супольнасці, дзе ўжо трывала замацаваўся пастулат аб праве нацый на самавызначэнне. Увогуле, прамежак часу, калі пачала нараджацца беларуская дзяржаўнасць, можна ахарактарызаваць як час узрушэнняў сусветнага маштабу.

Разглядаючы пытанне станаўлення беларускай дзяржаўнасці, даследчыкі звычайна засяроджваюць увагу на ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне. Пры гэтым знешнепалітычным пытанням надаецца другасны характар. У выніку прыніжаецца роля міжнароднага фактару ў справе стварэння беларускай дзяржаўнасці. Між тым фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ў пачатку ХХ ст. не толькі адчувала на сабе ўплыў міжнароднага фактару, але, як паказвае аналіз гістарычных падзей, часам ён быў вырашальным. Увогуле станаўленне беларускай дзяржаўнасці адбывалася ў надзвычайна складаных міжнародных абставінах, выкліканых Першай сусветнай вайной, рэвалюцыямі, распадам еўрапейскіх імперый, станаўленнем новых дзяржаў у цэнтры і на ўсходзе Еўропы, на фоне спробы стварэння новай сусветнай сістэмы, якая б забяспечвала калектыўную бяспеку і стабілізавала сітуацыю ў Еўропе.

Перад тым, як перайсці да разгляду працэсаў, што адбываліся ў той час ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне, варта прывесці выказванне сусветна вядомага гісторыка А. Дж. Тоінбі, якое даволі дакладна характарызуе сутнасць разглядаемага намі перыяду. Так, у працы «Даследаванне гісторыі» ён піша: «Прыблізна да 1875 г. два пануючых тады інстытуты – індустрыялізм і нацыяналізм – дзейнічалі разам, ствараючы вялікія дзяржавы. Пасля 1875 г. пачаўся адваротны працэс: індустрыяльная сістэма пачала рэзка нарошчваць сваю актыўнасць, так што размах яе дзейнасці набыў глабальны характар, тады як сістэма нацыяналізму пачала пранікаць углыб, у свядомасць нацыянальных меншасцяў, заахвочваў іх да стварэння сваіх суверэнных нацыянальных дзяржаў... Сусветная вайна 1914–1918 вынесла на паверхню тэндэнцыю, якая спела ўжо ня менш стагоддзя» [1, с. 19]

Пасля таго, як частка беларускіх зямель трапляе пад нямецкую акупацыю, група на чале з братамі Луцкевічамі, якая засталася ў Вільні, распачынае першыя спробы на практыцы рэалізаваць праект дзяржаўнай незалежнасці Беларусі ў выглядзе адраджэння Вялікага Княства Літоўскага, для чаго ўступае ў сувязь з мясцовымі дэмакратычнымі арганізацыямі палякаў, літоўцаў і яўрэяў. Асабліва актыўна разгортваецца гэтая праца пасля заявы канцлера Германіі Бэтман-Гольвега, што «вызваленыя ад Расіі землі ніколі не вернуцца назад пад маскоўскае ярмо».

Трэба зазначыць, што менавіта з 1915 года ваюючыя бакі пачынаюць актыўна выкарыстоўваць нацыянальную карту ў сваіх палітычных гульнях, каб дабіцца аслаблення супрацьлеглага боку. Так у прыватнасці ўздымаецца «польскае пытанне», якое і краіны Антанты і краіны Траістага саюза імкнуцца выкарыстаць у сваіх мэтах.

У гэтай сувязі беларускі нацыянальны рух застаецца ў цяні, бо ў вырашэнні беларускага пытання не былі зацікаўлены ні Расія, ні Польшча, ні Германія. Больш таго, першыя дзве краіны ўсяляк заміналі развіццю беларускага нацыянальнага руху, прадстаўляючы яго перад сусветнай супольнасцю ў якасці штучнага ўтварэння.

Што тычыцца пазіцый краін у ходзе І-ай Сусветнай вайны, то нас найперш цікавяць пазіцыі Расіі і Германіі, дзвюх вялікіх дзяржаў таго часу, ад волі якіх у многім залежала вырашэнне лёсу народаў Усходняй Еўропы.

Ужо 14 верасня 1914 г. царскі ўрад выклаў паслам саюзных краін сваё бачанне пасляваеннага свету. Так, у прыватнасці, да зменаў ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе было прапанавана наступнае: 1) тэрытарыяльныя змены павінны абумоўлівацца нацыянальным прынцыпам; 2) да Расіі далучаецца ніжняе цячэнне Нёмана і Ўсходняя Галіцыя. Познань, Сілезія і Заходняя Галіцыя ўключаюцца ў склад Польшчы, якую прапаноўвалася «аднавіць» у якасці дзяржавы, залежнай ад царскай Расіі; 3) Аўстра-Венгрыя пераўтвараецца ў трыадзіную манархію, якая складаецца з Аўстрыі, Чэхіі і Венгрыі; 4) Сербіі перадаюцца Боснія, Герцагавіна, Далмацыя і Паўночная Албанія; 5) Балгарыя ўзнагароджваецца Сербскай Македоніяй; 6) да Грэцыі далучаецца Паўднёвая Албанія. [2, с. 16.]

Як бачым, «паклапаціўшыся» аб амаль усіх славянскіх народах, пражываючых за межамі Расійскай імперыі, царскі ўрад «не заўважыў» толькі патрэбы беларусаў і ўкраінцаў, якія ўжо больш за 100 гадоў пражывалі ў межах Расійскай імперыі. Што ў рэшце рэшт і зразумела, бо кіраўніцтва Расіі працягвала заставацца на пазіцыях вялікадзяржаўнага шавінізму. Ігнаруючы нацыянальныя патрэбы беларускага народа, яно ўвогуле адмаўляла яму ў праве на існаванне, абвяшчаючы любыя праявы нацыянальнага руху «польскай інтрыгай», скіраванай на тое, каб адарваць «исконно рускія» землі ад імперыі.

У гэтых умовах свае спадзяванні на адраджэнне беларускай нацыі і задавальненне яе нацыянальных патрэб дзеячы беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ўскладалі не на царскі ўрад, а на дэмакратычныя змены ў грамадстве, а таксама на падтрымку гэтых намаганняў з боку сусветнага супольніцтва. Яны гатовы былі працаваць з любымі сіламі, якія прызнавалі права беларусаў на самавызначэнне.

Трэба зазначыць, што большая частка дзеячаў беларускага нацыянальнага руху (за выключэннем віленскага цэнтра) у той час не выстаўляла патрабавання аб поўнай дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, абмяжоўваючы свае жаданні стварэннем аўтаноміі Беларусі ў межах Расіі са сваім уласным соймам у Вільні, які б меў права заканадаўства ў мясцовых справах.

Але царскі ўрад, карыстаючыся ваенным часам, узмацніў паліцэйскі рэжым, вайсковая цэнзура не прапускала ні воднага «крамольнага», з яе пункту гледжання, матэрыялу. Фактычна падзеленая з 1915 г. лініяй фронту, Беларусь пераўтварылася ў вайсковы лагер, дзе забаранялася не толькі апазіцыйнае палітычнае жыццё, але нават выказванне эканамічных патрабаванняў і вядзенне нацыянальна-культурнай працы. Адзінай легальнай формай жыцця для беларускага нацыянальнага руху была праца ў так званых « бежанскіх камітэтах», якія дапамагалі пацярпелым ад вайны суайчыннікам. Але дзейнасць іх была значна абмежавана. Да таго ж гэтыя камітэты, раскіданыя па ўсей Расіі, фактычна не былі звязаны паміж сабой, не мелі адзінага кіруючага цэнтра і былі адарваны ад бацькаўшчыны.

Такім чынам, было зразумела, што ні ў ходзе вайны, ні пасля яе царскі ўрад не збіраецца вырашаць беларускае пытанне. Калі пад уплывам германскай палітыкі ён быў вымушаны заігрываць з польскім бокам у справе аднаўлення польскай дзяржаўнасці, то ў дачыненні да беларусаў ён не зыходзіў нават да адкрыцця беларускіх школ, не кажучы аб нечым большым.

Крыху іншымі былі адносіны да беларусаў у прадстаўнікоў кайзераўскай Германіі. Гэта было выклікана тым, што ў ходзе вайны немцы імкнуліся дасягнуць тых жа мэтаў, што і Расія – усталявання кантролю над Цэнтральнай і Усходняй Еўропай, але для паслаблення ворага звярталі ўвагу на нявырашанасць нацыянальнага пытання ў Расіі. У аснове іх палітыкі ляжаў вядомы прынцып «падзяляй і ўладар».

Трэба зазначыць, што да пачатку акупацыі ў немцаў не было зацікаўленасці ў беларускім пытанні, болей таго, да беларускага нацыянальнага руху яны ставіліся абыякава, бо ў ваенных планах Германіі не было месца для Беларусі. У агульным плане

гэта выглядала так: 1) адсоўванне Расіі на ўсход, дзеля чаго меркавалася адарваць Польшчу, Фінляндыю, Прыбалтыку, а ў далейшым, магчыма, Украіну і Каўказ; 2) стварэнне з « Рускай Польшчы» буфернай дзяржавы, залежнай ад Германіі; 3) навязаць Расіі кабальную гандлёвую дамову, каб пераўтварыць яе ў аграрны прыдатак Германіі. [2, с. 19.]

Але, па меркаванню даследчыка Ю. Туронка, «найважнейшым фактарам, якім тлумачыцца невялікае зацікаўленне нямецкіх аўтараў беларускім пытаннем, была пазіцыя ўрадавых колаў Рэйха, што грунтавалася на іх адносінах з Расіяй і вызначаных ваенных мэтах. Імкнучыся стварыць новыя суадносіны сіл і дасягнуць палітычнай і эканамічнай дамінацыі ва Ўсходняй Еўропе, нямецкі імперыялізм не выпускаў з поля зроку сваіх эканамічных інтарэсаў у Расіі і меў надзеі на пашырэнне гаспадарчых адносін з гэтай краінай пасля вайны. Гэтая акалічнасць мела вялікае значэнне асабліва для нямецкай прамысловасці,для якой расійскі рынак збыту ўяўляў шматабяцальны шанс развіцця. У выніку эканамічны фактар супрацьдзейнічаў імкненням да празмернага аслаблення і расчлянення Расіі і ўплываў на зацікаўленасць урада Рэйха ў як мага хуткім дасягненні з ёю мірнага пагаднення.» [3, с. 12.]

Такім чынам, галоўная лінія паводзін нямецкага кіраўніцтва ў дачыненні беларускага пытання зводзілася да падтрымкі яго ў той ступені, у якой гэта адпавядала нямецкім палітычным і эканамічным інтарэсам.

Адказ на пытанне, чаму на акупаванай немцамі тэрыторыі беларускі рух развіваўся больш хуткімі тэмпамі, чым на тэрыторыях, якія засталіся пад уладай Расіі, ляжыць не ў нейкіх добрым стаўленне да беларусаў, а хутчэй у іх абыякавасці. Па-першае, ім не трэба было пераконваць мясцовае насельніцтва ў тым, што гэта «спрадвечна германскія» землі. Па-другое, каб пазбегнуць у зоне акупацыі залішняй сацыяльнай напружанасці, нямецкае камандаванне вырашыла адносіцца да ўсіх нацыянальнасцяў, пражываючых на захопленых землях, аднолькава, што, у сваю чаргу, дазволіла беларусам упершыню адчыніць свае школы і ўвогуле займацца культурнай справай. Па-трэцяе, гэта ўпісвалася ў агульную палітыку Германіі выкарыстоўвання нацыянальных рухаў супраць Расіі.

Адносна германскага камандавання можна сказаць, што яно калі не дапамагала, дык хаця б і не замінала развіццю беларускага руху на акупаваных тэрыторыях. Але была і сіла, якая фактычна перашкаджала беларускаму руху. Ведаючы пра дэклараваны Германіяй, Аўстра-Венгрыяй у лістападзе 1916 года план стварэння «незалежнай» Польшчы, палякі імкнуліся пераканаць немцаў у прыналежнасці да Польшчы заходніх зямель Беларусі і Літвы і ўвогуле пашырыць як мага далей свой уплыў на Ўсход.

Валодаючы большымі матэрыяльнымі і людскімі рэсурсамі, чым беларусы, частка шавіністычна настроеных палякаў усяляк замінала беларускаму руху і дасягнула ў гэтай справе значных поспехаў. Аб гэтым сведчыць камандуючы нямецкімі войскамі Людэндорф, які пісаў: «Беларус не ўваходзіў у разлік. Палякі пазбавілі яго нацыянальнасці, не даючы нічога ўзамен. Восенню 1915 года я хацеў зарыентавацца ў рассяленні беларусаў. Але напачатку знайсці іх было літаральна немагчыма. І толькі пазней высветлілася, што гэта вельмі распаўсюджаны народ, знешне аднак спаланізаваны і такі адсталы культурна, што дапамагчы яму можна толькі праз доўгачасовае ўздзеянне». [3, с. 17.]

Усе гэтыя акалічнасці ставілі перад дзеячамі беларускага нацыянальнага руху на першы план патрэбу ў давядзенні да міжнароднай супольнасці сам факт існавання беларускай нацыі і яе жыццёвых патрабаванняў. З гэтай мэтай прадстаўнікі Беларускага Народнага Камітэта ў Вільні прымаюць удзел у канферэнцыі народаў Расіі ў Стакгольме (красавік 1916 г.) і ў ІІІ-й канферэнцыі народаў у Лазане (чэрвень 1916 г.), дзе выказваюць спадзяванне, што які б не быў канец вайны, народы Еўропы дапамогуць беларусам забяспечыць іх палітычныя і культурныя правы. [4, с. 28]

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі, нягледзячы на патрабаванне Беларускага Нацыянальнага камітэта аўтаноміі для Беларусі, а таксама выступленне беларускіх прадстаўнікоў на Ўсерасійскай дзяржаўнай нарадзе дэмакратычных сіл (верасень 1917), Часовы ўрад лічыў вырашэнне нацыянальнага пытання прэрагатывай Устаноўчага сходу.

Па выказванню віднага дзеяча беларускага руху, старшыні Беларускага Абласнога Камітэта пры Ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў Я. Канчара: «Камітэт Дзяржаўнай Думы, Прадпарламент і Часовы ўрад вялі барацьбу з сепаратызмам, у т.л. з усімі партыямі, камітэтамі і групамі нацыянальнага накірунку. Сепаратызм асабліва «самостійны», «незалежны», «отделенческий» разглядаўся як узурпацыя ўлады будучага Ўстаноўчага Сходу». [5] Гэтая халоднасць Часовага ўрада прывяла дзеячаў беларускага нацыянальнага руху да думкі, «што праўдзівую волю Беларусь здабудзе толькі тады, калі за палітычнымі лозунгамі будзе стаяць маса – арганізаваны народ. Пачалася шырокая арганізацыйная работа. Па ўсей Беларусі і па ўсім ваенным фронце адбываліся шматлікія з'езды, якія пакідалі пасля сябе выканаўчыя органы – Рады, і ўсюды ў адзін голас дамагаліся асобнага дзяржаўнага ўстройства Беларусі ўсе яшчэ ў агульнарасейскай федэрацыі.» [6, с. 11.]

Новы імпульс беларускі рух атрымаў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі бальшавікі, якія прыйшлі да ўлады, абвясцілі лозунг «права нацый на самавызначэнне» дзяржаўнай палітыкай. Нягледзячы на тое, што ў хуткім часе Савецкі ўрад пацвердзіў незалежнасць Польшчы і Фінляндыі, у дачыненні да Беларусі гэты лозунг яшчэ доўгі час заставаўся толькі лозунгам. Трэба было вызначыцца, з кім і па якому шляху павінна рухацца беларуская нацыя, якія прыярытэты развіцця павінны быць вылучаны на пярэдні план.

Калі разглядаць Беларусь на фоне развіцця аналагічных рухаў у краінах Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы, то яна і храналагічна, і этапна ў цэлым упісваецца ў агульнаеўрапейскі працэ, с. Беларусь прайшла шлях ад патрабавання аўтаноміі да патрабавання дзяржаўнай незалежнасці, якое было пастаўлена ў перыяд Першай сусветнай вайны, як і ў большасці краін дадзенага рэгіёна. Гэта было звязана з тым, што ў час вайны кантроль за нацыянальнымі меншасцямі з боку кіраўніцтва еўрапейскіх імперый значна аслабеў. Як піша даследчык І. Поп: «да палітычных катастроф у ходзе І-ай сусветнай вайны прыгнечаныя народы ў складзе трох імперый не маглі разлічваць на дзяржаўную незалежнасць.» Большага поспеху на шляху дзяржаўнага самавызначэння краіны Цэнтральнай Еўропы дасягнулі (у параўнанні з прыгнечанымі народамі Расійскай імперыі), у значнай ступені дзякуючы таму, што іх буржуазія мела больш магчымасцяў для манеўру і валодала большым вопытам. «Яна вучылася на памылках рускай буржуазіі, страціўшай уладу ў Кастрычніку 1917 г., і ...імкнулася не паўтарыць іх.» [7, с. 5.]

На працэс утварэння беларускай дзяржаўнасці актыўна ўплывалі розныя знешнепалітычныя фактары, якія знаходзіліся ў цеснай сувязі паміж сабой. У залежнасці ад палітычнай кан'юнктуры, якая складвалася ў адпаведныя перыяды, кожны з іх займаў дамінуючае становішча ў працэсе ўтварэння беларускай дзяржаўнасці. Беларускаму нацыянальнаму руху прыходзілася ўвесь час прыстасоўвацца да змен у знешнепалітычнай абстаноўцы. Акрамя гэтага пры аналізе станаўлення беларускай дзяржаўнасці нельга выпускаць з поля зроку тое радыкалізуючае ўздзеянне на беларускіх палітычных дзеячаў, якое аказваў працэс станаўлення дзяржаўнасці ў нашых бліжэйшых суседзяў – Польшчы, Літвы, Латвіі, Украіны.

Такім чынам, можна канстатаваць, што тэарэтычнае развіццё ідэй нацыянальнай дзяржаўнасці знаходзілася на тым жа ўзроўні, што і ў большасці народаў Цэнтральнай і

Ўсходняй Еўропы. Што ж тычыцца цяжкасцяў з іх практычным увасабленнем, то на гэта меліся падставы аб'ектыўнага характару.

## Список источников и литературы

1.Тоинби, А. Дж. Постижение истории. / А. Дж. Тоинби – М. Прогресс; 1991. – 736 с.
2. История дипломатии. В 6 т. – М.: Политическая литература, 1965. – Т. III. – 831 с.
3. Туронак, Ю. Беларусь пад немецкай акупацыяй. / Ю. Туронак – Мінск., 1993. – 236, с.
4. Турук, Ф. Белорусское движение. / Ф. Турук – М. 1921. – 144 с.
5. НАРБ. Ф. 331 воп. 4. сп. 26. арк. 8.
6. Навіна, А. Палітычныя лозунгі беларускага рух.//Наша ніва. Зб., Вілня, Друк.1920. – 48 с.
7. Поп, И. Проблема новой государственности в Центральной и Юго-Восточной Европе в ХХв./ И. Поп //К 70-летью образования самостоятельных государсв в Центральной и Юго-Восточной Европе. – М., 1989. – 267 с.

УДК 94:323.1(=162.1)(476) «1914-1921»

**А.М. Кротов** (Гомель)

## «ВРЕМЯ СОБИРАТЬ КАМНИ»: ЭТНОПОЛИТИЧЕСКАЯ МОБИЛИЗАЦИЯ БЕЛОРУССКИХ ПОЛЯКОВ В 1914–1921 гг.

В статье рассматривается процесс вовлечения белорусских поляков в общественно-политическую жизнь Польши в 1914-1921 гг. и делается вывод, что, в конечном счёте, он привёл к восприятию ими польской национальной идеологии и активному участию в борьбе за польские государственные и национальные интересы.

Крушение польской государственности в конце XVIII в. воспринималось поляками как божье наказание, как расплата за пресловутую «польскую анархию». Но и в этих условиях польский народ сумел сохранить свою этническую общность, национальный характер, особый менталитет. Более того, фактор внешней угрозы и культурной деполонизации даже помог полякам развить представления о своей национальной исключительности, особой роли в истории Европы и её судьбе. Вскоре после разделов на свет появилась идеология польского мессианства, в соответствии с которой польская диаспора призвана была участвовать во всеобщей борьбе за свободу народов, воскресение которых должно было привести к воскресению Польши. Одним из создателей этой идеологии и, может быть, самым успешным её популяризатором был А. Мицкевич [1]. Вряд ли есть основания сомневаться в том, что для многих поляков идеи мессианства были не пустыми словами. Идеология мессианства была вкладом в польский культурный этнонационализм, а этот национализм, направленный на сохранение целостности народа, на развитие его языка, культуры, исторического наследия, в свою очередь, сыграл положительную роль в процессе возрождения польского государства. А идея этнополитической мобилизации стала мощной мобилизующей силой, основным средством борьбы всех польских политических групп, составлявших национальную элиту. Главным лозунгом такой мобилизации было национальное возрождение.

Возрожденческая фразеология красиво звучала, воодушевляла людей, чувствовавших в условиях иноземного господства национальный гнёт и болезненно переживавших его, вселяла надежду на добрые перемены в жизни. Всего этого оказалось вполне достаточно, чтобы пойти за новообретёнными вождями. Причём полякам даже не надо было попадать под гипноз их высокопарных патриотических